# АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАЕ НАПАЎНЕННЕ ВОБРАЗАЎ ТЭТРАЛОГІІ ВЯЧАСЛАВА АДАМЧЫКА

**Свірыдовіч К.У.**

*УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна"*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца галоўныя вобразы тэтралогіі В. Адамчыка, выяўляецца іх агульначалавечы змест. Акрэсліваецца актуальнасць твора для нашага часу.

**Ключавыя словы:** жыццё, душа, сумленне, каханне, нормы маралі, агульначалавечыя прабллемы.

В. Адамчык увайшоў у гісторыю нацыянальнай культуры як адзін з выдатных майстроў беларускай прозы. Па меркаванні Я. Лецкі, аўтара кнігі "Хараство і боль жыцця: Нарыс творчасці Вячаслава Адамчыка", творчаць гэтага празаіка з'яўляецца прыкладам пакутлівага авалодання сакрэтамі класікі, набліжэння да мастацкай дасканаласці [3, с. 60]. У пэўнай ступені пра гэта сведчыць агульначалавечае напаўненне вобразаў тэтралогіі В. Адамчыка – галоўнай кнігі пісьменніка.

Галоўнымі героямі твора з'яўляюцца Улас, Алеся і Міця Корсакі, Імполь, Хрысця і Чэся, праз іх вобразы празаік вырашае маральна-этычныя праблемы. Значнае месца ў творы адводзіцца вобразу Алесі Мондрых, маладой і прывабнай знешне жанчыне. Не маючы мажлівасці выйсці замуж за сына асадніка, якога кахала, яна заседзелася ў дзеўках, урэшце вымушана была выйсці за нялюбага, што і зламала яе жаночы лёс. "Ішла замуж не любіўшы – спадзявалася, што звыкнецца, а звыкнуцца не магла. Здаецца, валасы на сабе рвала б: столькі хлопцаў у сватах было, а яна ўсё перабірала – то малы, то брыдкі, то «рускае веры» (Алеся была каталічкаю),

покуль не заседзелася ў дзеўках і не сталі сватацца ўдаўцы” [1, с. 13]. Нядоўга прыйшлося жыць Алесі з нялюбым чалавекам, рана яна засталася ўдавой, не набыўшы нават дзяцей.

Пасля смерці мужа Алеся бярэ сабе ў прымы маладога, прыгожага малацьбіта Імполя, спадзеючыся, што нарэшце зажыве шчаслівым, ціхім жаночым жыццём. Усім сэрцам пакахала яна гэтага чалавека. Але іх шчасцю, як здавалася Алесі, перашкаджалі свякроў і залоўка. Старая Таквілля дакарала нявестку, бо лічыла яе галоўнай прычынай смерці сына. Алеся здзяйсняе злачынства – атручвае родных нябожчыка-мужа, якія да гэтага перапісалі на яе зямлю. Але не прынесла сапраўднага шчасця чужая бацькаўшчына Алесі, яна ператвараецца ў рабыню зямлі і бытавых абставін. Нявольна пачувае сябе і Імполь, аддаляецца ад прагматычнай спадарожніцы і здраджвае ёй. “Аказалася, што нельга спадзявацца на жыццё і помсціць яму. Алеся не разумела і не адчувала гэтага няпісанага закону” [2, с. 535], – заўважыў В. Каваленка, аўтар раздзела па творчасці В. Адамчыка ў акадэмічным выданні “Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя”. А даследчык Я. Лецка выказаў меркаванне, што Алеся “сімвалізавала сабой захопніцкую сілу і ўладу” [3, с.113].

Праз гэты жаночы вобраз празаік распрацоўвае праблемы віны, самагубства, пакаяння. В. Адамчык паказаў, як потым усё жыццё душу і сумленне гераіні будзе раздзіраць віна за здзейсненае, і гэта сведчыць пра тое, што гуманныя пачуцці перавышаюць злобу і нянавісць ў яе сэрцы. Чэрствасць не захапіла жанчыну, яна можа спачуваць, шкадаваць і дапамагаць іншым. Прыкладам гэтага з’яўляецца выратаванне старой Рэпіхі, якая выпаўзла з палаючага хлява. Алеся не зважае на тое, што была яна маткай партызана Рэпкі,

што жорстка распраўляўся і з чужымі, і са сваімі (пазней забіў яе брата).

Духоўныя пошукі і працэс грамадзянскага станаўлення асобы паказаны ў тэтралогіі праз вобраз Міці Корсака. Ён бачыць жыццё шырэй за іншых вяскоўцаў. Гэта свядомы беларус, не адарваны ад народа адукацыяй. В. Каваленка звярнуў увагу, што герой "шукае душэўнага паратунку, унутранай апоры ў каханні да Чэсі. Праўда, іх пачуцці складваюцца няпроста – праз перашкоды жорсткага, антычалавечнага свету даводзіцца прадзірацца гэтаму каханню з вялікім пакутным болем і крывёй" [2, с. 539]. Супярэчлівым бачыцца меркаванне Я. Лецкі, што "аўтар звузіў грамадскае выяўленне характару Міці Корсака, засяродзіўшыся на паказе інтымных ўзаемаадносін героя з Чэсяй Доўнар" [3, с. 112]. Нам падаецца, што інтымныя пачуцці ўзвышаюць маладых людзей. Іх каханне пяшчотнае і гарэзлівае, бурнае і своеасаблівае. Перад Міцем адкрываецца новы свет хараства. Шчырае каханне акрыляе душу хлопца, дае яму сілы на пераадоленне выпрабаванняў лёсу. Цяпер ён разумее, што нясе адказнасць не толькі за сябе, але і за абранніцу.

Праблема кахання вырашаецца пісьменнікам і праз вобраз Хрысці, маладой, прыгожай дзяўчыны з чулай і міласэрнай душой. В. Каваленка выказаў думку, што "яна і Імполя пакахала, шкадуючы яго як чалавека, падманутага Алесяй і таму гаротнага. Выгнаная з Корсакавай хаты, не маючы ніякага прытулку, не ведаючы, што з ёй будзе, яна разрываецца ад жалю да Імполю" [2, с. 535]. Невыпадковым бачылася даследчыку імя гераіні – "ад Хрыста".

Як бы не ўцякала Хрысця ад Імполя і кляцьбы Алесі, ад сябе збегчы яна не можа. Пачуцці да малацьбіта не даюць спакойнага жыцця. Яна разрываецца паміж каханнем і этычнымі нормамі таго

часу. Здаецца, што ў Імполя і Хрысці атрымалася б добрая сям'я, каб не выпала на іх долю ваенннае ліхалецце.

Аналізуючы вобразную сістэму тэтралогіі, В. Каваленка звяртае ўвагу на "душэўную непастаяннасць, люмпенскую здатнасць прыстасавальніцтва да ўмоў" [2, с. 535] Імполя. Ён схіляецца то да Алесі (маці яго сына), то да Хрысці, якая прываблівае яго сваёй непасрэднасцю і неабцяжаранасцю побытам. Калі Хрысцю растрэльваюць, Імполь зноў з Алесяй. Але перагарэла ўжо яе каханне. Сэнсам жыцця жанчыны-маці В. Адамчык робіць дзіця. Пісьменнік пераконвае, што найперш у мацярынстве павінна сцвярджацца жанчына, асабліва, калі не складваецца яе асабісты лёс.

Клопат аб дзецях становіцца сэнсам жыцця ўдаўца Уласа Корсака. Ён прыкладны сем'янін, любячы муж (і праз гады з любасцю згадвае жонку-нябожчыцу), уважлівы бацька, паказаў дзецям якімі павінны быць сапраўдныя ўзаемаадносіны паміж сямейнікамі. Усё цяжэй на душы ў Корсака і з прыходам Імполя, і са смерцю Таквіллі з нямой Еўкай. Ён не ведае, як сябе паводзіць: ці то захінаць дачку ад злых языкоў, ці то вінаваціць яе. Улас вырашае, што б там не здарылася, ён заўсёды будзе побач з Алесяй, бо, акрамя яе і Міці, яму няма больш чым даражыць. У гэтым праяўляецца яго бацькоўская любоў да сваіх дзяцей. Маральны выбар Уласа Корсака – жыць дзеля дзяцей. Самаахвярнасць героя, як вызначальная рыса яго характару, выявілася і ў адносінах да чужых людзей. Стары Корсак хавае дома савецкага камандзіра, і гіне, "баронячы людскую праўду, будучы расстраляным і спаленым немцамі разам з тымі людзьмі, якіх хацеў выратаваць" [2, с. 534]. Свячэнне высакароднасці, што сыходзіла ад Уласа, адчувалася і аднавяскоўцамі.

Зварот В. Адамчыка да агульначалавечых праблем забяспечыў тэтралогіі актуальнасць, твор прымушае думаць, разважаць, асэнсоўваць, многае ў ім сапраўды павучальна.

## ЛІТАРАТУРА


1. Адамчык, В. Чужая бацькаўшчына / В. Адамчык. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 366 с.

2. Каваленка, В. Вячаслаў Адамчык / В. Каваленка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – 2-е выд. – Мінск, 2001–2002. – Т. 4. Кн. 1. – 2002. – С. 521–548.

3. Лецка, Я. Хараство і боль жыцця: Нарыс творчасці Вячаслава Адамчыка / Я. Лецка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 128 с.